# PATER NOSTER

„Я ёсьць дарога, праўда й жыцьцё”

(Ян 14:6)

№2 (43)
люты 2008

Выданьне рымска-каталіцкай парафіі сьвятога Казіміра ў Жлобіне


# Вялікі Пост - шлях ачышчэньня



З Папяльцовае серады пачаўся пост. Падзея ў жыцьці хрысьціяніна, з аднаго боку, звычайная, бо паўтараецца з года ў год, а з другога – выключная. Кожны раз гэтыя 40 дзён становяцца для нас і выпрабаваньнем, і абяцаньнем, шляхам збаўленьня і шляхам пакуты. І кожны раз нашыя сэрцы заміраюць у чаканьні цудоўных пераменаў, якія прынясе гэтая дарога.

Звычай пасціцца вядомы яшчэ з дахрысціянскіх часоў. У старажытнасці юдэі ўстрымліваліся ад ежы, маліліся і прыносілі ахвяры, калі народу пагражала небясьпека альбо бедства. Распачыналі пост таксама тыя асобы, якіх напаткала гора (сьмерць блізкага чалавека, напрыклад) або чакала важная падзея (40-дзённы пост Майсея перад прыняцьцем Дэкалёгу). Падчас посту юдэі пераапраналіся ў рыззё, здымалі абутак, пасыпалі галаву попелам, - звычай які дайшоў да нашых часоў. Сынагогі ў такія дні напаўняліся стонам і енкам: у сьлязах роспачы вымальвалася прабачэньне. Пост у тыя даўнія старазапаветныя часы стаў для многіх фармальнасьцю: губляў свой зьмест на карысьць формы. Езус Хрыстус, аблічаючы пыху і двудушнасьць фарысэяў, абвінавачваў іх сярод іншага і ў крывадушнасьці: “І калі посьціце, ня будзьце заняпалыя, як крывадушнікі; бо яны пампрочваюць аблічны свае, каб паказаць сябе людзям посьнікамі. Праўду кажу вам, што яны атрымліваюць узнагароду сваю. А ты, калі посьцішся, намасьці галаву тваю і ўмый аблічча тваё, каб явіцца посьнікам не перад людзьмі, а перад Айцом тваім, Які ў тайнасьці; і Айцец твой, Які бачыць у тайнасьці, аддасьць табе на яве” ( Мц 6, 16-18). Такім чынам, Збаўца засяроджвае ўвагу не на дакладным выкананьні ўсіх правілаў, а на шчырасьці, зь якой вернік посьціцца. Менавіта гэта і выклікала зьдзіўленьне і нават абурэньне юдэйскага народу, давала паставу для абвінавачваньняў у адступніцтве ад Закону: “Тады прыходзяць да Яго вучні Янавыя і кажуць: чаму мы і фарысэі посьцім многа, а Твае вучні ня посьцяцца?” (Мц 9, 14). Пост як сродак, а не як мэта – вось да чаго заклікаў Езус, які сам пасьціўся 40 дзён і начэй у пустэльні, каб у цішыні і супакоі падрыхтавацца да свайго служэньня: “Тады Езус быў паведзены Духам у пустэльню, на спакушэньне ад д’ябла. І, пасьціўшы сорак дзён і сорак начэй, напасьледак згаладаўся” (Мц 4, 2).

Сучасны пост зьяўляецца своеасаблівым вяртаньнем да крыніцаў, бо ў першыя стагодзьдзі хрысьціянства пасьціліся толькі ў Вялікую Суботу і Вялікую Пятніцу напярэдадні Вялікдня, потым пост расьцягнуўся на увесь тыдзень, а ўжо з VI ст. абавязковымі для вернікаў сталі 40 дзён посту. З аднаго боку, было вяртаньне да рыгарызму, а з другога – словы Езуса аб посьце “не перад людзьмі, а перад Айцом”.

Молячыся цяпер, просячы прабачэньня за свае грахі, абмяжоўваючы сябе ў ежы, мы павінны памятаць, што Богу не патрэбны пустыя высілкі, паказны аскетызм, што малітва і пост не павінны быць фармальнасьцю, зробленай для “крыжыка”. Толькі тады яны становяцца шляхам ачышчэньня, дарогай, што загартоўвае і ў той жа час робіць пакорнымі. 40 дзён могуць нас наблізіць да Езуса, але могуць і не прынесьці аніякага плёну. Вам вырашаць.

**Алена СЫСОЙ**

kamunikat.org

# Сьвята Трох Каралёў на розны лад

Колькі сьветлых і радасных сьвятаў мы павіталі на працягу гэтых месяцаў! Колькі прыемных успамінаў засталося! У кожнай сям'і ёсьць свае звычаі і традыцыі сустраканьня сьвятаў. І нам захацелася даведацца, як яны сьвяткуюцца ў іншых. Цікава, што менавіта сьвята Трох Каралёў у розных краінах Эўропы аднолькава ўшанаванае, аднолькава ўрачыста абстаўляецца, але заўсёды мае нацыянальны калярыт і сваю асаблівую рызынку.

Сьвята гэтае сьветлае і радаснае, зьвязанае з падарункамі малому Збавіцелю, таму, напрыклад, у Гішпаніі на гэтае сьвята дзеткам у боцікі і шкарпэткі бацькі кладуць падарункі, а не на Раство, як прынята ў большасьці краінаў. Дзеткі да блеска начышчаюць боцікі, кладуць у іх салому і чакаюць раніцы з захапленьнем, бо калі яны добра сябе паводзілі, Каралі пакінуць ім падарункі і цукеркі, а калі не – могуць насыпаць вугля.

Яшчэ у цёплай Гішпаніі ёсьць вельмі цікавая традыцыя. Напярэдадні сьвята ў гарадох і вялікіх вёсках увечары да берага падыходзіць карабель, зь яго высажваюцца тры каралі са сьвітай, іх сустракаюць фаервэркамі, а потым яны сходзяць і ідуць па вуліцах горада ў сьвяточнай працэсіі, даўжыня якой можа быць больш за кілямэтар. На чале йдуць малыя з барабанамі, за імі на карэтах едуць дарослыя зь немаўлятамі, пасьля – духавы аркестар. Замыкае шэсьце карэта з трыма каралямі-магамі (а ў некаторых мясцовасьцях яны едуць на вярблюдах). Каралі шчодра раздаюць пачастункі.

У Італіі таксама звычай вельмі арыгінальны. У гарадох пануе казачна-фэстывальная атмасфэра. А сымбалем сьвята становіцца добрая фея Бэфана. Яна ноччу спускаецца у дамы праз комін і кладзе падарункі у дзіцячыя шкарпэткі ў памяць тых дароў, якія Езусу прынеслі Каспэр, Бальтазар і Мэльхіёр. Як і ў суседняй Гішпаніі, непаслухмяным малым італьянцам ад яе дастаюцца вугалькі, але яны



зробленыя з пафарбаванага цукру (у Партугаліі дзеткі баяцца знайсьці у чаравіку бульбіну, якая таксама азначае, што яны захоўвалі сябе ня вельмі добра). У Рыме ў гэты дзень арганізуюць кірмаш, а ў Вэнэцыі – разнакаляровае шэсьце па гарадзкіх каналах.

Акрамя таго, што сьвята гатае вясёлае і радаснае, у гэты дзень не забываюць пра тых, каму неабходная дапамога і падтрымка.

Французы у гэты дзень зьбіраюць ахвяраваньні, а пасьля зьбіраюцца за сямейным сталом і частуюцца міндальным пірагом, упрыгожаным каронай з залатой паперы. Унутры пірага запякаюць фарфоравую цацку, і той, каму яна трапляецца, становіцца каралём вечара.

Ахвяраваньні зьбіраюць і ў Чэхіі. Малыя у касьцюмах трох каралёў ходзяць па дамам, сьпяваюць калядныя песьні і зьбіраюць грошы у дапамогу бедным. Упершыню збор сродкаў быў арганізаваны у горадзе Оламуц, а з 2001 года ён стаў трыдцыйным па ўсёй рэспубліцы, і тады атрымалася сабраць больш за 30 мільёнаў чэскіх крон.

Палякі сустракаюць сьвята таксама, як і беларусы. Сьвеньцяць на ўрачыстай імшы крэйду і пішуць на дзьвярах пачатковыя літары імёнаў Трох Каралёў. Заўсёды верылі ў тое, што надпіс гэты абараняе хату і гаспадарку, і спускае на сям'ю Божую ласку.

Летувісы верылі, што літары дапамогуць ім уберагчыся нават ад навальніцы. У іх ёсьць таксама свае цікавыя традыцыі сьвяткаваньня. У Вільні ў тэатралізаваным шэсьці прымаюць удзел сем галоўных пэрсанажаў – трохмэтровыя каралі (палетувіску іхнія імёны гучаць як Каспарас, Мяркяліс і Балтазарас), арханёл і пастухі. Тры Каралі жадаюць гораду плённага, пасьпяховага году і прыносяць падарункі ў ясьлі на галоўнай плошчы Вільні.

Традыцыі у розных народаў розныя, але ва ўсіх іх праяўляецца галоўнае – у гэты сьвяточны дзень людзі яшчэ раз успамінаюць сьвятое Божае Нараджэньне, ушаноўваюць і дзякуюць Пану, дораць любоў і радасьць сваім блізкім, а таксама не забываюцца на тых, хто, як і немаўля Езус, патрабуе падтрымкі і дапамогі. У такія моманты сакральны сэнс тых падзеяў кранае усіх, нават самыя маленькія сэрцы. Праз такія сьвяточныя падзеі вера, надзея і любоў перадаюцца малым дзеткам ад бацькоў, таму шанаваць і зьберагаць традыцыі для сучаснасьці вельмі важна.

**Алена АРЦЁМЕНКА**

# Вялікі Пост

## гісторыя. традыцыі. сучаснасьць.

6 лютага 2008 года пачынаецца Вялікі пост — саракадзённы літургічны перыяд падрыхтоўкі да Велікодных святаў. Ён традыцыйна пачынаецца ў Папяльцовую сераду, якая называецца так ад абраду пасыпання галоваў попелам.

У гэты дзень у касцёлах адбываецца благаслаўленне попелу са спаленых галінак вербаў, асвечаных у леташнюю Пальмовую нядзелю. Гэтым попелам святар пасыпае галовы вернікаў са словамі: «Кайцеся і верце ў Евангелле» альбо «Памятай, што ты — прах, і ў прах вернешся». Гэтае літургічнае дзеянне выяўляе нашу гатоўнасць да пакаяння, да велікапосных аскетычных практыкаванняў, а таксама падкрэслівае праўду пра смяротнасць і прамінальнасць часовых дабротаў.

На ўзор саракагадовага вандравання, якое, распачаўшыся ў свята Пасхі, прывяло выбраны народ з егіпецкай няволі ў зямлю абяцаную, а таксама па прыкладу самога Хрыста, які сорак дзён прабываў у пустыні, Касцёл на працягу сарака дзён рыхтуецца да Пасхальнага Трыдуума. Перыяд Вялікага посту звязаны з пакаяннем і аскезай, а таксама асаблівым чынам прысвечаны разважанню над Мукай Пана (пасійныя набажэнствы — Крыжовы шлях, Песні жальбы). У хрысціянскай традыцыі Вялікі пост заўсёды быў звязаны з устрыманнем ад удзелу ў забавах, ад мясных страваў і ад алкаголю. Знешнімі праявамі Вялікага посту з'яўляюцца: фіялетавы колер літургічнага адзення, адсутнасць у святой Імшы спеву «Аллелюя» і гімна «Хвала на вышынях Богу...», больш сціплае аздабленне касцёлаў, а з пятай нядзелі Вялікага посту — захінутыя фіялетавай тканінай крыжы. Вялікі пост — гэта таксама перыяд падрыхтоўкі катэхуменаў да прыняцця сакрамэнту хросту, які традыцыйна ўдзяляецца ў Пасхальную вігілію.





У адпаведнасці з касцёльнымі наказамі кожны каталік абавязаны прынамсі раз на год у Велікодны перыяд, які ахоплівае акрамя самога Велікоднага перыяду таксама і перыяд Вялікага посту, прыступіць да сакрамэнту пакаяння (споведзі) і прыняць святую Камунію. У Папяльцовую сераду і ў Вялікую пятніцу Мукі Пана прадпісаны абавязковы строгі пост — на працягу дня можна толькі адзін раз паесці дасыта, устрымліваючыся ад мясных і малочных страваў, а таксама ад алкаголю. Згодна з традыцыяй, строгі пост захоўваецца і ў Вялікую суботу. Ён не з'яўляецца абавязковым для маленькіх дзяцей, кормячых маці і хворых.

Абмежаванне ў ежы і піцці з'яўляецца аскетычным практыкаваннем і праявай пакаяння, а таксама наследаваннем Хрыста, які сам часта пасціўся і падкрэсліваў важнасць посту (пар. Мц 17, 21 і Мц 6, 16-19). У Касцёле адрозніваюцца строгі пост і ўстрыманне (абстыненцыя). Па пятніцах Касцёл наказвае ўстрымлівацца ад мясных страваў. Пост — гэта адзін з найважнейшых хрысціянскіх учынкаў разам з малітваю і міласцінай. Такім чынам, пакаянне ўключае акрамя посту таксама малітву і добрыя ўчынкі. У перыяд Вялікага посту ў парафіях праводзяцца духоўныя практыкаванні — рэкалекцыі — у якіх можа ўдзельнічаць кожны вернік.

**Паводле Catholic.by**

# Шлюб ў сучасным сьвеце



Не сакрэт ні для каго, што традыцыйныя каштоўнасьці ў нашым грамадзтве перагледжваюцца. Таму тое, што ва ўсе часы успрымалася як аснова і фундамэнт чалавечага жыцьця, губляе сваю важнасьць. На гэты раз мы хацелі б зьвярнуцца да ролі шлюбу ў сям'і і стаўленьня да іх сучаснае моладзі.

Гістарычна зьмянялася форма, у якой большасьць людзёў стваралі сям'ю. Калі доўгі час самым значным быў касьцёльны шлюб, які мусіў быць адным у жыцьці перад Богам і людзьмі, то ў XIX ст. пачала распаўсюджвацца форма "шлюбу грамадзянскага". Гэта не сумеснае жыцьцё (канкубінат), як думаюць зараз, а шлюб, афармлены і зарэгістраваны грамадзянскімі ўладамі. У гэтай форме людзі па закону пачалі мець права разводзіцца, жаніцца йзноў. Зразумела, што шлюб пачаў успрымацца па-іншаму, не як адзіны і адказны выбар на ўсё жыцьце. Але зараз нават гэтая форма перастала мець каштоўнасьць для многіх з нас, і ўсё больш узьнікаюць у моладзі пытаньні, ці трэба ім гэта ўвогуле.

Маладыя людзі, якія ня хочуць "афармляць" свае адносіны, тлумачаць сваё рашэньне па-рознаму. Але хутчэй за ўсё, гаворка ідзе аб тым, што, маўляў, трэба ведаць адзін аднаго добра, трэба час, каб зразумець, твой гэта чалавек ці не, трэба паспрабаваць пажыць разам, каб потым не расплачвацца ўсё жыцьцё за пасьпешнасьць.

Зразумела, што па хрысьціянскіх законах такое недапушчальна, але нам хацелася б паказаць, што касьцёл змагаецца за шлюб і сям'ю ў традыцыйнай форме не таму, што гэта догма і парушаць яе нельга. Гэта мае пад сабой сур'ёзны, нават філязофскі сэнс. І асноўная справа тут у поглядзе на каханьне як аснову шлюбу.

Каханьне можна ўспрымаць з двух бакоў. Калі верыць у лёс і ў тое, што кожнаму чалавеку на Зямлі прызначаны хтосьці адзін, ёсьць толькі адна другая палавінка, можна шукаць яе да самай сьмерці, і нават, абраўшы кагосьці, сумнявацца, той гэта чалавек ці не. Мажліва, тыя, хто хочуць пажыць разам, пазнаць адзін аднаго, у душы разважаюць менавіта так. Нібыта ёсьць каханы чалавек, але невядома яшчэ, той ён ці не.

Сэнс каханьня і хрысьціянскай любові іншы. Каханьне пачынаецца зь вялікай рашучасьці, вялікай адказнасьці за іншага. І справа ў тым, каб прыняць на сябе гэтую адказнасьць. Вялікі расейскі пісьменьнік Л. Таўсты пісаў: "Мы думаем, што нас любяць таму, што гэта мы такія добрыя, не задумваючыся над тым, што добрыя тыя, хто нас любіць". Гэтае глыбокае разважаньне як раз і паказвае, што моц каханьня ідзе з нашага сэрца, і справа тут зусім не ў

якасьцях чалавека, на якога нашае каханьне праліваецца.

Чалавек створаны Богам як вольная істота, і асаблівасьць і ўнікальнасьць чалавека ў тым, што Пан зь вялікай любові да нас стварыў нас разумнымі і даў права выбіраць, праяўляць сваю волю. Таму калі чалавек верыць у сілу лёса, гэта крыўдзіць Бога – сілу Ягонай павагі і любові да чалавека такія людзі не разумеюць і ня вераць ў яе. Сапраўдны хрысьціянін ня будзе адмаўляцца ад адказнасьці і перадаваць яе ў рукі лёса, як рабілі гэта паганцы (напрыклад, мы ведаем багінь лёса Мойр у грэцкай міталёгіі). Таму і ня мае сэнса шукаць таго, хто прызначаны гэтым лёсам. Трэба, карыстаючыся воляй, якую даў нам Пан, прымаць на сябе цяжар нашага выбара, па-сапраўднаму любіць таго, хто побач.

Нам падаецца, што сапраўднае каханьне пачынаецца менавіта са шлюбу, таму што толькі тады чалавек прызнае гатоўнасьць да падтрымкі і любові да другога чалавека на ўсё жыцьце, не зважаючы ні на што. Гэты крок паказвае рашучасьць і адказнасьць, і калі яго ня зробіш, не зразумееш моц сапраўднага каханьня. І сілы да гэтага каханьня трэба шукаць у сваёй душы, а не чакаць, што знойдзецца чалавек, любіць якога будзе прасьцей.

Калі разважаць з гэтага пункту гледжаньня, сумеснае жыцьцё бяз шлюбу зусім губляе сэнс. Калі мы кажам, што правераем адзін аднаго, мы прызнаем, што папросту ў нашай душы няма сілаў да сапраўднага каханьня. І калі чалавек сапраўды верыць ў ласку Бога, любіць Яго і адчувае ўдзячнасьць за тое, што ён дае нам волю нашага ўласнага выбару, ён ня будзе чакаць, пакуль лёс падорыць яму “другую палавінку”, а будзе шукаць у сваім сэрцы магчымасьць і моц для сапраўднага каханьня. Таму шлюб мае вялікае значэньне, і менавіта ў той форме, якую забясьпечвае касьцёльны шлюб – адзіны і сталы на ўсё жыцьцё.

**Алена АРЦЁМЕНКА**

# Павага да старых

## справа кожнага

Няраз, едучы ў грамадзкім транспарце, можна стаць сьведкай ня вельмі прыемнай сытуацыі, што ўсё болей і болей уваходзіць у нашае жыцьцё. Напэўна, вы ўжо здагадаліся, аб чым пойдзе гаворка, а, можа, і самі неаднойчы разважалі на гэтую тэму. Так ці не, але праблема павагі да старых людзей існуе сёньня ў нашым жыцьці і ўсё часьцей гэтая зьнявага зыходзіць з боку моладзі. Ці часта вы бачылі, каб малады хлапец ці нават дзяўчына саступілі месца бабуле ці дзядулe? Напэўна, дзесьці адзін выпадак зь дзесяці, а, можа, і дваццаці... Чаму? Чаму так адбываецца? Ці не вучылі нас яшчэ ў дзіцячым садку паважаць старэйшых? Ці не казалі дапамагаць ім, саступаць месца, пераводзіць праз дарогу? Самае жахлівае тое, што кожны гэта ведае, але не паступае так. Можа, гэта ўжо ня “ў модзе”, ці гэта сорамна?

Успомніце, хто, яшчэ ў маленстве, расказаў вам найцікавейшую казку? Хто вучыў вас быць добрым? А ці не бабуля прывяла вас упершыню ў касьцёл і навучыла першай малітве? Дык гэтага, здаецца, нямала для таго, каб паважаць і любіць старых людзей...

Памятаю, як заўсёды ў дзяцінстве чакаеш лета, каб хутчэй насталі канікулы, скончылася гэтая “нецікавая” школа, і наступіў вясёлы і вольны час. Памятаю, як хутка зьбіраеш свае рэчы і едзеш у вёску да бабулі і дзядулі, якія ўжо таксама чакаюць цябе. Памятаю, як заходзіш у хату, а там такі прыемны пах сьвежасьпечаных пірагоў! А пасьля смачнага абеду, бяжыш на вуліцу і сустракаешся са сваімі сябрамі. А на наступны дзень з раніцы адпраўляешся ў лес разам зь дзядулем. Няўжо гэта не цудоўна?

Хіба гэтага мала для таго, каб любіць і паважаць старых? І ня толькі сваіх родных, але й астатніх. Пан Бог вучыць нас любіць кожнага “бліжняга свайго, як самога сябе”. Дык давайце ж выконваць гэта. У сьвеце існуе нейкая раўнавага: калі ты любіш, будуць любіць і цябе, і гэтая любоў пераходзіць ад аднаго чалавека да другога. А калі дрэнна адносішся да каго-небудзь, дык і да цябе таксама будуць адносіцца. Карацей кажучы, кожны з нас будуе сваё жыцьцё, сваю будучыню. Калі адносіцца добра ня толькі да сваіх родных, дык і іншы чалавек будзе так паступаць – усё ў нашым жыцьці ўзаемазьвязана.

Дык давайце ж будзем любіць і паважаць старых людзей! Яны пражылі ўжо цэлае жыцьцё, яны больш за нас ведаюць аб усім. І веды гэтыя – мудрасьць, якую калісьці і мы будзем перадаваць сваім дзецям і ўнукам. Яны – няхай і нашае мінулае – але тое мінулае, безь якога не было б і будучыні – нас. Дык давайце будзем маліцца і любіць сваіх дзядуль і бабуль, каб добры Бог заўсёды апекаваўся над імі. І гэтак жа ставіцца да ўсіх старэйшых людзей.

**Алена МІРАНОВІЧ**

## Цыкль „Аповяды пра Апосталаў” - аўтарская рубрыка Аляксандра Царкоўскага

# Сьвяты Апостал Якуб

**“І паклікаўшы дванаццаць вучняў Сваіх, Ён даў ім уладу над нячыстымі духамі, каб выганяць іх і лячыць усялякую хваробу і ўсялякую слабасьць”**

**(пар. Мц 10, 2)**



Езус Хрыстус, першы з Апосталаў і Настаўнік (Габрэям 3, 1), Баранак Божы паклікаў Сабе на служэньне 12 вучняў, даўшы ім зразумелае прызначэньне - несьці Ісьціну ў сэрцы людзей. Некаторыя зь Ягоных вучняў (Пётра, Ян і Якуб) был асаблівым чынам вернымі Богу, за што ўдастоіліся асаблівае міласьці: сталі сьведкамі ўваскрасеньня дачкі Яіра (Лк 9, 51) і Перамяненьня Пана (Лк 9, 28).

Кожны хрысьціянін - гэта, перадусім, чалавек, які імкнецца сэрцам спазнаць Езуса, Сына Божага. У гэтым жа сэньсе значэньне і моц Апосталаў унікальныя - менавіта яны зьяўляюцца першымі носьбітамі тых ведаў, якія пераказаў нам Хрыстус. І іхняе пакліканьне - гэта пакліканьне амбасадара, які прадстаўляе волю свайго Правіцеля.

Езус Хрыстус паклікаў галілейскага рыбака Якава і ягонага малодшага брата Яна, сыноў Завядзеевых, да служэньня (Мц 4, 21-22), сказаўшы ім “ад гэтага часу будзеце лавіць чалавека” і вызначыў кожнаму зь іх асобае месца ў Сваім Касьцёле. Як і Ян, Якаў быў энэргічным і настойлівым. Пан не абвінавачваў братоў за дзёрзкасьць нават тады, калі Якуб зь Янам напярэдадні Галготы спрачаліся паміж сабой, хто сядзе бліжэй да Бога ў Валадарстве Нябесным (Мк 10, 35-37). Якуб разам з іншымі Апосталамі быў напоўнены Духам Сьвятым у дзень Пяцідзесятніцы (Дз 2, 1-4), удзельнічаў у стварэньні першых хрысьціянскіх супольнасьцяў.

Езус абяцаў Езусу даць піць з кубка, зь якога Сам павінен быў піць (Мц 20, 22-23). Хрыстус насьледаваў кожнаму жадаемае: Пётра стаў увасабленьнем Улады, Ян - Любові, а Якуб - самога Эвангельля, бо менавіта ён першы з Апосталаў быў казьнёны за прапаведваньне Уваскрасеньня па загаду цара Ірада Агрыпы, каторы “забіў Якуба, брата Яна, мячом”. Апостал Якуб - адзіны Апостал, чыя сьмерць апісаная на старонках Новага Запавета.

У літаратуры Якуба Завядзея таксама часта называюць Якубам Старэйшым, каб адрозьніць яго ад апостала Якуба Алфея і Якуба “брата Пана”, Апостала з 70, ці Якуба Малодшага. Якуб згаданы ў сьпісах апосталаў у Эвангельлях ад Мацьвея (Мц 10,

2), ад Марка (Мк 3, 17), ад Лукі (Лк 6, 14), а таксама ў Дзеяньнях Апосталаў (Дз 1, 13).

Пасьля Ўзьнясеньня Хрыста, Якуб адправіўся ў Гішпанію і памежныя краіны, дзе праслаўляз Бога. Пасьля ён зноў вярнуўся ў Ерузалем. У Ерузалеме ён асуджаў юдэяў і змагаўся зь імі (Мк 3, 17), мужна адстойваючы праўду Хрыста.

Як і Езуса, фарысэі шукалі перамагчы Якуба ў спрэчцы, аднак Апостал зь вялікай стараннасьцю аблічаў іхнія жорсткія сэрцы. Менавіта тут мае пачатак легенда, згодна зь якой законьнікі падкупілі нейкага Гермагена, мудраца і мага, каб той зьняважыў і перамог Якуба ў размове. Гермаген адправіў на баталіі свайго вучня Пліта, сказаўшы пры гэтым, што Якуб нават вучня не пераадолее. А Пліт стаяў нямы перад апосталам, бо мудрасьць Дуа Сьвятога была ў Якубе. Пасьля вучань мудраца вярнуўся назад і прасіў Гермагена навярнуцца ў Хрысьціянства. Аднак ганарлівасьць Гермагена не дазволіла яму пачуць пажаданьне і ён наказаў сваім бесам зьвязаць Пліта. Пліт таемна паслаў да апостала вестку, што ён магіяй Гермагена зьвязаны бесамі. Даведаўшыся пра гэта, апостал перадаў яму свой ручнік, сказаўшы, каб ён узяў тканіну і прамовіў такія словы: “Пан вызваляе вузьнікаў, Пан адкрывае вочы сьляпым, Пан выпрамляе сагнутых” (Пс 145, 7-8). Пліт вымавіў гэтыя словы і вызваліўся, пасьля чаго адправіўся да Якуба і прыняў хрост. Калі Гермаген даведаўся пра гэта, адправіў бесаў, каб тыя прывялі Якуба і Пліта зьвязанымі, аднак як толькі бесы наблізіліся да дому Апостала, сьвяты Анёл Панскі паразіў іх. І тады бесы ўсклікнулі да сьвятога Якуба: “Якуб, Хрыстовы Апостал, будзь младсэрны да нас, бо мы, па загаду Гермагена прыйшлі зьвязаць цябе і Пліта, а цяпер самі моцна зьвязаныя і моцна пакутваем”. І сьвяты Якуб сказаў бесам: “Анёл Божы, які вас зьвязаў, да пазбавіць вас ад путаў, і вы йдзіце і прывядзіце мне сюды Гермагена, не зрабіўшы яму аніякай крыўды”. Яны яго прывялі і той, ад страху і пераканаваньня, раскаяўся і, ўсьлед за сваім былым вучням ахрысьціўся. Юдэі ж раззлаваліся моцна і ўгаварылі цара Ірада спасласць ганеньні на Касьцёл Хрыстовы і забіць Якуба: “Ірад падняў рукі на некаторых з тых, хто належыць да Касьцёла, каб зрабіць ім злое, і забіў Якуба, брата Янавага, мячом. Бачучы, што гэта даспадобы юдэям, усьлед за гэтым узяў і Пятра, - тады былі дні апрэснокаў, - і, затрымаўшы яго, пасадзіў у вязьніцу” (Дз 12, 1-4).



Колокольня монастыря во имя св. ап. Иакова в Париже. 1998

У адным з аповядаў пра сьвятога Якуба гаворыцца, што калі апостал быў асуджаны Ірадам на сьмерць, чалавек, імя якога Іосія (здраднік Якуба), бачучы мужнасьць сьвятога Апостала, паверыў у Хрыста, і разам зь Якубам бў асуджаны на сьмерць. Калі ж яны схілілі свае галовы на адсячэньне, Іосія маліў сьвятога Якуба, каб той прабачыў яму ягоную здраду. Апостал, абняўшы і пацалаваўшы яго, сказаў: “Супакой з табою”. І абодвух пакаралі.

Па некаторых зьвестках, каля 830 г н.э. у Гішпаніі знайшлі паданьне, па якім парэшткі Якуба зь Ерузалема былі перанесеныя ў Кампастэлу („Груд Зоркі”). Мясцовы кароль Альфонс II распаўсюдзіў вестку аб наяўнасьці ў ягонае зямлі мошчаў Апостала Якуба, і арганізаваў да магільні паломніцтва. Пазьней кароль стаў зьбіраць падатак на пілігрымкі - так шмат было жадаючых дакрануцца да сьвятога. У 1884 г. сьвяты айцец Леў XIII афіцыйна пацьвердзіў, што парэшткі сапраўдныя.

2004 год у Эўропе быў абвешчаны годам Апостала Якуба. Дарогі, па якіх йшлі сярэднявечныя пілігрымы, сьцякаліся ў Кампастэлу і ўтваралі сетку гэаграфічных паведамленьняў, служачы Эўропе мастом узаемадзеяньня культур.

Памяць сьвятога Апостала Якуба Завядзеева адзначаецца 25 ліпеня.

**Аляксандар ЦАРКОЎСКІ**

| Люты 2008 | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Нядз. | Пан. | Аўт. | Сер. | Чацьв. | Пятн. | Суб. |
| | | | | | 1 | 2 Ахвяраваньне Пана |
| 3 IV звычайная | 4 | 5 сьв. Агаты | 6 Папяльцовая Серда | 7 | 8 | 9 |
| 10 I Вялікі Пост | 11 НПМ з Люрду | 12 | 13 | 14 Кірыла і Мятода | 15 | 16 |
| 17 II Вялікі Пост | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 катэдры сьв. Пятра | 23 сьв. Палікарпа |
| 24 III Вялікі Пост | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | |

# Біблійныя разважаньні на Вялікі пост у тваёй скрынцы

## падпіска на духоўную рассылку

У год, прысьвечаны Божаму Слову, сальватарыянская супольнасьць у Беларусі жадае дзяліцца багацьцем свайго духоўнага вопыту. З пачатку Вялікага посту можна падпісацца на электронную рассылку разважаньняў на тэму нядзельных чытаньняў з Эвангельля.

Аўтар разважаньняў кс. Кшыштаф Вонс SDS кажа, што ягоныя разважаньні маюць характар «імпульсаў, арыенціраў», якія дапамагаюць паглыбіцца ў Слова. Яны падрыхтаваныя такім чынам, каб быць даступнымі для ўсіх, хто хоча маліцца Эвангельлем, незалежна ад узроўню біблійнай падрыхтоўкі. Аўтар сьвядома адмаўляецца ад вербальнага аналізу зьместу тэкста і засяроджвае ўвагу на адкрыцьці яго духоўнага сэнсу. Ён часта зьвяртаецца да ўяўленьня чытача, запрашаючы яго ўключыць у малітву свае пачуцьці і быць ня толькі назіральнікам, але і ўдзельнікам падзеяў, апісаных у Эвангельлі.

Мэта адна: адшукаць у эвангельскім тэксьце ключавыя пункты, якія і стануць падставай для разважаньня над Словам і жыцьця ім сярод штодзённасьці, як сьвяточнай, так і звычайнай. Прапанаваныя ва ўступе заахвочваньні, думкі і пытаньні павінны дапамагчы зразумець Божае Слова, услухацца ў яго і адчуць яго моц у штодзённым жыцьці.

Падпісацца на рассылку можна па адрасе: sdsby@list.ru.

# АНОНС: Тэлемост Менск-Ватыкан

1 сакавіка 2008 г. з нагоды VI Эўрапейскага дня студэнтаў унівэрсытэтаў а 18-й гадзіне ў архікатэдральным касьцёле Імя Найсьвяцейшай Панны Марыі ў Менску будзе ўсталяваны малітоўны тэлемост, які ўпершыню ў гісторыі Каталіцкага Касьцёла ў Беларусі злучыць паміж сабою Менск і Апостальскую Сталіцу.

Тэлемост праводзіцца штогод падчас Вялікага посту, каб у ружанцовай малітве зьяднаць са Сьвятым Айцом моладзь з розных куткоў сьвету. Сёлета ў малітве са сваімі аднагодкамі, якія разам з Бэнэдыктам XVI зьбяруцца ў зале Паўла VI у Ватыкане, будуць удзельнічаць маладыя людзі з Румыніі (Бухарэст), Італіі (Неапаль), Францыі (Авіньён), Гішпаніі (Таледа), Вялікабрытаніі (Эдынбург), ЗША (Ню-Ёрк), Кубы (Гавана), Бразыліі (Апарэсіда), Мэксыкі (Мехіка), Эквадора (Лоха) і Беларусі (Менск). Тэлемост зь беларускага боку будзе рэалізоўвацца пры дапамозе Белтэлерадыёкампаніі.

**Старонка падрыхтаваная паводле Catholic.by**

**PATER NOSTER**

газэта ствараецца хрысьціянскай моладзьдзю

*штомесяцовы бюлетэнь парафіі сьвятога Казіміра ў Жлобіне*

Заснавальнік - кс. Леанард Акалатовіч; галоўны рэдактар - Алесь Карцель; выпускны рэдактар - Алена Арцёменка; макетоўшчык, карэктар - Алесь Карцель. Адрас: 247210, Гомельская вобл., г. Жлобін, вул. Юных піянэраў, 24. Тэл./факс: (02334) 2-94-84. GSM: (029) 630-87-79. e-mail: centrum.pn@gmail.com. Выдаецца зь ліпеня 2004 г. на беларускай мове (клясычны правапіс). Надрукавана на ксэраксе. Наклад: 299 асобнікаў.